# БЫЛІ БАІ НА ОДЭРЫ...

У сталіцы нашай Радзімы — Маскве жыве наш зямляк, Герой Савецкага Саюза генерал-маёр Аляксандр Апанасавіч Жук. Нядаўна ён прыслаў у краязнаўчы музей Чапялёўскай сярэдняй школы свае ўспаміны аб баях з нямецка - фашысцкімі захопнікамі на подступах да Берліна. Ніжэй друкуем гэтыя ўспаміны.

НАШЫ перадавыя часці падышлі да ракі Одэр. Па заходняму берагу ракі праходзіў моцны абаронны рубеж праціўніка, які прыкрываў подступы да Берліна. На гэты, абсталяваны па апошняму слову інжынернай тэхнікі, рубеж гітлераўскае камандаванне ўскладала вялікія надзеі.

136-я Кіеўская дывізія атрымала загад фарсіраваць раку і захапіць плацдарм на яе заходнім беразе. Гэта цяжкая задача ўскладнялася яшчэ тым, што дывізія не мела ніякіх пераправачных сродкаў. Усё, што можна было выкарыстаць для гэтай мэты, гітлераўцы знішчылі загадзя.

У падраздзяленнях дывізіі пачалася старанная і ўсебаковая падрыхтоўка да пераправы. Асабліва напружаная работа праходзіла ў 342 стралковым палку, якім у той час давялося мне камандаваць.

Пераправа пачалася ноччу пры захаванні паўнейшай маскіроўкі і цішыні. Аднак фашыстам удалося выявіць пераправу і па нашых лодках быў адкрыт агонь. Да раніцы на заходні бераг Одэра змагло пераправіцца каля 175 чалавек. Па сігналу пераправіўшыхся артылерысты зрабілі агнявы налёт на пярэдні край абароны праціўніка, а фарсіраваўшыя раку воіны перайшлі ў атаку. У рукапашнай схватцы фашысты былі выбіты з першай траншэі, і мы замацаваліся на плацдарме. Усе намаганні гітлераўцаў скінуць савецкіх воінаў у раку не ўвянчаліся поспехам.

Нашы воіны біліся з непахіснай стойкасцю, праяўлялі масавы гераізм. Асабліва моцнаму націску ворага падвяргалася рота, якой камандаваў Н. П. Ляднёў. У крытычны момант бою, калі здавалася, што лёс роты вырашан, Ляднёў падняў байцоў у атаку. Нечаканасць і рашучасць атакі ашаламілі гітлераўцаў, і яны былі адкінуты назад.

Нашы сілы на плацдарме няспынна нарошчваліся. Не лічачыся з вялікімі стратамі, фашысты ўвесь час падкідвалі рэзервы і беспярапынна контратакавалі нашы часці. У самыя напружаныя мінуты бою некалькі разоў прыходзілася па радыёстанцыі выклікаць агонь нашай артылерыі на сябе. Адважныя савецкія воіны ўтрымалі захоплены плацдарм. У наступную ноч на плацдарм былі перапраўлены астатнія падраздзяленні палка. У жорсткіх баях гераічныя воіны 342 стралковага палка ўтрымалі і расшырылі плацдарм на заходнім беразе ракі Одэр, дзякуючы чаму забяспечылі пераправу і паспяховае наступленне галоўных сіл дывізіі.

Мне, як камандзіру палка, прыйшлося непасрэдна кіраваць пераправай, захопам плацдарма, яго ўтрыманнем і расшырэннем, знаходзячыся ў баявых парадках салдат. За гераізм і адвагу, праяўленыя пры фарсіраванні Одэра, вялікая колькасць воінаў палка была ўзнагароджана ордэнамі і медалямі СССР, а найбольш вызначыўшымся было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, у тым ліку і мне.

А. А. ЖУК.



На здымку: Герой Савецкага Саюза генерал-маёр Аляксандр Апанасавіч Жук.